


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (1082) ● Чацвер, 6 сакавіка 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## СВЯТА ЖАНЧЫН ПЛАНЕТЫ

8 Сакавіка — Міжнародны жаночы дзень.

У 65-ы раз у гэтым годзе будзе адзначацца Міжнародны жаночы дзень 8 Сакавіка — дзень салідарнасці працаўніц усёй планеты, іх аб'яднання у барацьбе за мір і бяспеку народау, сацыяльны прагрэс, шчасце дзяцей.

У нашай краіне свята гэта даўно ужо стала ўсенародным. І з кожнай вясной яно усё больш радаснае і светлае, бо з году у год мацнее наша Радзіма, расце яе міжнародны аўтарытэт. А сёлета свята будзе праходзіць напярэдадні 30-годдзя Перамогі у Вялікай Айчыннай вайне, у якой разам з усім савецкім народам масавы гераізм і мужнасць праяўлялі савецкія жанчыны. Знамянальна, што вобраз жанчыны у той час стау сімвалам маці-Радзімы, якая клікала на разгром фашысцкіх орд.

Многае змянілася на зямлі за мінуўшыя тры дзесяцігоддзі. У доўгай і упартай барацьбе Савецкага Саюза, іншых краін сацыялістычнай садружнасці, усіх міралюбівых прагрэсіўных сіл супраць імперыялізму і рэакцыі атрыманы важныя перамогі, на міжнароднай арэне адбыліся пазітыўныя змены, усё больш рашуча усталёўваюцца у адносінах паміж краінамі прынцыпы мірнага суіснавання, з'явіліся рэальныя перспектывы пазбаўлення чалавецтва ад пагрозы тэрмаядзернай катастрофы.

Немалая заслуга ў гэтым і міжнароднага дэмакратычнага жаночага руху, адным з першых атрадаў якога з'яўляецца Камітэт савецкіх жанчын, які удастоен у 1973 годзе высокай урадавай узнагароды — ордэна Дружбы народаў.

Масавы удзел жанчын у класавай барацьбе, у антыімперыялістычным руху, у прыватнасці у барацьбе за мір, з'яўляецца важнай рысай нашай эпохі. Палітычная і сацыяльная актывізацыя жанчын істотна паскараецца іх удзелам у грамадскай вытворчасці, прымяненнем жаночай працы ва усё большых маштабах. Зараз у свеце налічваецца 562 мільёны працоўных жанчын, што складае каля адной трэці усёй рабочай сілы. Па прагнозах эканамістаў і сацыёлагаў, тэндэнцыя да няспыннага росту занятасці захаваецца і надалей. Згодна з разлікамі Міжнароднага бюро працы, у бліжэйшыя 15 год колькасць працуючых жанчын дасягне 656 мільёнаў.

Прызнаннем важнага укладу жанчын у прагрэс чалавецтва, у справу міру і барацьбы за сацыяльную справядлівасць з'яўляецца абвяшчэнне Генеральнай Асамблеяй ААН 1975 года Міжнародным годам жанчыны.

Зараз ідзе актыўная падрыхтоўка да правядзення Міжнароднага года жанчыны на міжнародным, рэгіянальных і нацыянальных узроўнях. У рамках Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі і іншых арганізацый жанчын распрацаваны канкрэтныя прапановы, сярод якіх асобае значэнне мае рашэнне правесці шырокі міжнародны форум — Сусветны кангрэс жанчын. Ён адбудзецца у кастрычніку 1975 года у сталіцы Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі — Берліне і унясе важны уклад у поспех Міжнароднага года жанчыны.

Мэты Міжнароднага года жанчыны адпавядаюць інтарэсам усяго чалавецтва. Яго правядзенне з'явіцца важнай падзеяй не толькі для жанчын і іх арганізацый, але і для усіх прагрэсіўных сіл, падтрымка і супрацоўніцтва якіх неабходны для ліквідацыі перашкод на шляху ажыццяўлення правоў жанчын.

Узорам рашэння жаночага пытання для усіх краін і народаў з'яўляюцца Савецкі Саюз, краіны сацыялістычнай садружнасці. Сацыялізм карэнным чынам змяніў становішча жанчыны у грамадстве, забяспечыў ёй раўнапраўе ва усіх галінах палітычнага і сацыяльнага жыцця, прадаставіў ёй шырокія магчымасці атрымання адукацыі і раскрыцця талентаў, стварыў умовы для шчаслівага мацярынства. Камуністычная партыя Савецкага Саюза робіць усё, каб з кожным годам паляпшаліся умовы працы і быту жанчын, каб яны мелі яшчэ больш магчымасцей для росквіту здольнасцей, плённай працы і грамадскай дзейнасці, для выхавання дзяцей.

У адказ на клопаты партыі жанчыны нашай краіны аддаюць усе свае помыслы, працу і веды справе будаўніцтва камунізму.

## ДА НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

У канцы мінулага тыдня у актавай зале галоўнага корпуса БДУ адбыўся сход актыву універсітэта, прысвечаны падвядзенню вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва за 1974 год і прыняццю новых абавязацельстваў на сёлетні год.

Выступаючы з дакладам, рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі ахарактарызаваў дзейнасць універсітэцкага калектыву у мінулым годзе і паведаміў, што па выніках сацыялістычнага спаборніцтва у сістэме Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР нашаму універсітэту прысвоена першае месца.

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва універсітэцкіх калектываў аб'явіў старшыня мясцкома дацэнт І. Г. Родзін.

Сярод факультэтаў лепшых паказчыкаў дабіўся фізічны факультэт. Паколькі першае месца вырашана не прысуджаць нікому, фізфак заняў другое месца. На трэцім — два факультэты: хімічны і юрыдычны.

Лепшай кафедрай прызнана кафедра гісторыі КПСС прыродазнаучых факультэтаў.

Сярод іншых падраздзяленняў БДУ пераможцамі сталі бібліятэка (I месца), вучэбны аддзел (II месца), навуковы аддзел (III месца).

Згодна з пастановай калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і прэзідыума Рэспубліканскага камітэта прафсаюза 10 супрацоўнікаў БДУ удастоены ганаровага звання «Ударнік дзевятай пяцігодкі», 89 супрацоўнікаў узнагароджаны знакам «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1974 года».

Рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі уручыў пераможцам спаборніцтва вымпелы, ганаровыя граматы універсітэта, нагрудныя знакі.

Пераможцаў конкурсу 1974 года па культуры вытворчасці і ахове працы аб'явіў начальнік аддзела аховы працы І. А. Ляпёшкін. Лепшых вынікаў у конкурсе дабіліся хімічны і юрыдычны факультэты, якім прысвоена званне «Факультэт высокай культуры і аховы працы» з уручэннем Ганаровай граматы. Званне «Калектыў высокай культуры» і ганаровыя граматы атрымалі таксама кафедры: хіміі высокамалекулярных злучэнняў, агульнай фізікі, крыміналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі.

За актыўны удзел у конкурсе ганаровымі граматамі узнагароджаны 52 чалавекі.

Удзельнікі сходу аднадушна прынялі новыя абавязацельствы на 1975 год.

**Наш кар.**

## П А УНІВЕРСІТЭТУ

**3—5 сакавіка на гістфаку праводзіўся агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці, у якім удзельнічалі студэнты усіх курсаў. Журы узначальваў в. а. дэкана А. Г. Кляцкоў.**

* * *

**У гэтыя дні гасцямі універсітэта былі удзельнікі Усесаюзнай нарады пісьменнікаў і крытыкаў «Неўміручы подзвіг народа у Вялікай Айчыннай вайне» сакратар Саюза пісьменнікаў СССР Міхаіл Луконін, народны паэт Беларусі Пімен Панчанка, галоўны рэдактар часопіса «Наш современник» Сяргей Вікулаў, паэты Сюнебай Каралееў і Генадзь Бураўкін, пісьменнік Барыс Васільеў і літаратуразнаўца Анатоль Абрамаў.**



**З 1 сакавіка па ўсёй краіне пачаўся абмен камсамольскіх дакументаў.**

**У гэты дзень новыя членскія білеты з профілем У. І. Леніна на вокладцы атрымалі і лепшыя камсамольцы аддзялення палітэканоміі.**

**З пачаткам абмену камсамольскіх дакументаў моладзь віншавалі камсамолец 40-х гадоў, Герой Савецкага Саюза, прафесар кафедры гісторыі КПСС Д. П. Жмуроўскі, член-карэспандэнт АН БССР, прафесар В. Д. Ткачоў, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі 1974 года у галіне навукі І. А. Малевіч.**

**НА ЗДЫМКАХ: з віншаваннем выступае В. Д. Ткачоў; вось яны, першыя уладальнікі новых білетаў.**

Фота М. Нечыпарэнкі.








**НА ЗДЫМКАХ:** ст. лабарант кафедры геаметрыі Г. М. Якубоўская; свой дваццаць пяты год працы ў БДУ адзначае сёлета дацэнт кафедры зарубежнай літаратуры В. М. Цімафеева; чацвёртакурсніцу аддзялення палітэканоміі Дзіяну Смагіну ўсе ведаюць як дэкана грамадскіх падрыхтоўчых курсаў; заўсёды гатова пачаставаць вас А. Л. Лаўрэнава.

# ЗВЫЧАЙНЫ ЛЕС? САВЕЦКІ!

ВЯСНА 1944-га...

Ноч прыкрыла мільгануўшыя зоркі халоднымі цёмнымі воблакамі. З-за кудлатай сасны падзьмуў вецер, вільготны, вясновы. Можа, зараз ужо і сакавік, хто ведае. Можа, нават 8 Сакавіка—яе любімае свята, на якое за час вайны Раіса і забылася...

Яна выглядзела сухую палянку, удваіх з кулямётчыкам палажылі параненага камісара пад дрэва, прымасціліся побач. Тры чалавекі на ўвесь лясны масіў... Атрад імя Варашылава III Мінскай брыгады з боем прарваўся скрозь варожае акружэнне і цяпер быў недзе далёка-далёка. У апошняй сутычцы цяжка параніла камісара брыгады. Раісе разам з таварышам удалося вынесці яго з-пад куль, праўда, на тэрыторыю, акружаную немцамі... Цяпер гэтыя трое мерзлі ў балотах без харчоў, без медыкаментаў...

Яна завязала тужэй хустку. «Дзіўна, шосты а мо сёмы дзень без атрада, амаль нічога не ела, а голаду не адчуваю». Заварушыўся паранены. Ціха сказала:

— Пацярпіце, раніцай мы абавязкова знойдзем ручай ці расы крыху сабяром, пацярпіце...

А сама нявесела ўсміхнулася. Не, не наконт ручая—тут была ўпэўнена, што нешта знойдуць. Усміхнулася з сябе. «Каго гэта я суцяшаю? Ды ў гэтага чалавека мужнасці ўтрая больш... Аднак моцна страляюць. Наша артылерыя... І так блізка. Хутчэй, родныя...»

Рука натыкнулася на клубок мінулагодняй травы.

Зямля — цёмная, вільготная... Хутка зацвітуць пралескі. «Не, не трэба паміраць. А калі знойдуць фашысты... Жывымі не здадзімся. Але гэта адзіны, крайні выпадак. А так — жыць, жыць, зямлю есці, але жыць».

Сон не ішоў. Расхвалявалася, успомніла родны Рудзенск, маці, школу. Потым універсітэт, фізічны факультэт. Удалося скончыць толькі адзін курс, ды ці скончыць?.. О, як добра спалася першакурснікам перад апошнім экзаменам: здадуць матаналіз і... Але раніцай іх чакала неймаверна большае выпрабаванне, чым сесія. Раніцай увесь Мінск прачнуўся ад грукату танкаў. Раіса глядзела на гэтыя машыны, на суровыя твары салдат, што ішлі на захад, вачыма бачыла ўсё, але ў свядомасці ніяк не ўкладваліся паняцці «вайна» і «смерць». І, толькі едучы дадому ў Рудзенск, слухаючы расказы спадарожнікаў, зразумела—здарылася самае страшнае...

Старэйшыя таварышы звязаліся з партызанамі, хутка частка падпольшчыкаў перайшла ў атрад. У іх ліку была і Раіса Плашчынская.

Так прыходзіла сталасць.

...Яна зноўку пачала ўглядацца ў цёмнае неба. Заварушыўся і застагнаў паранены. Схамянулася, паклала далонь на лоб: не, здаецца, усё ў парадку. Халодным ветрам прынесла кропелькі не то снегу, не то дажджу. Аблізала абсмаглыя губы.

...У атрадзе дзяўчына рабіла ўсё: хадзіла з аператыўнай групай у засады, удзельнічала ў дыверсіях на буйных дарогах, на лініях сувязі ў раёне Слуцкай шашы. Некалькі разоў яны нападалі на фашысцкія гарнізоны, вялі «рэйкавую вайну». Калі не было вылазак, мыла адзенне, варыла ежу. Не, не адна—побач былі сяброўкі, слаўныя, смелыя, баявыя: чарнавокая Надзея Меркуль, спакойная медсястра Аня, настаўніца-палітрук.

О, каб зноў быць з атрадам, а не ляжаць тут, пад носам у фашыстаў, і чакаць, чакаць... Каб зноў мець сваю зямлянку, хоць поўную вады: за дзень выбіралі па 200 вёдзер. Зноў са сваёй агітбрыгадай хадзіць па вёсках, чытаць людзям газеты, што скідвалі ў атрад з самалётаў, расказваць праўду аб становішчы на фронце, выпускаць «баявыя лісткі»...

Пачало падмарожваць. Вецер даўно сціх. Толькі пад раніцу ёй удалося, нарэшце, заснуць.

Яна спала і яшчэ не ведала, што назаўтра блакада будзе прарвана, яны злучацца з атрадам, а яшчэ праз тры месяцы будзе вызвалены Мінск, і ёй давядзецца працаваць у Мінскім сельскім райкоме камсамола. Было холадна ў зямлянках, але будзе яшчэ халадней у аўдыторыях універсітэта, куды яна зноў прыйдзе пасля вайны, у інтэрнаце на Нямізе, дзе яны будуць жыць па 20 чалавек у пакоі, спаць у вопратцы, пісаць у пальчатках, але займацца, займацца, прагна, захоплена.

Сёння старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі Раіса Варфаламееўна Плашчынская — маці дваіх дачок — архітэктара Тамары і фізіка Вольгі— і яшчэ маці многіх студэнтаў—яе выхаванцаў.

— Надыходзіць вясна, зусім не падобная на тую, якую вы перажылі ў 1944-м. Што б Вы хацелі пажадаць усім жанчынам у дзень 8 Сакавіка? — пытаюся я ў Раісы Варфаламееўны.

— Самае галоўнае—каб ніколі яны не бачылі жахаў вайны. А калі будзе мір, то будзе і шчасце, і радасць, і вясна.

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.

# САМЫЯ ЛЕПШЫЯ

...Заняткі скончыліся. Я іду па універсітэцкаму гарадку, дзе зараз, у перапынку паміж зменамі, шумна. Міма мяне няспешнай хадою праходзяць рабяты-студэнты, прабягаюць стайкамі дзяўчаты. Лаўлю сябе на думцы, што ў кожнай з іх мімаволі шукаю сваіх новых знаёмых...

Упершыню я ўбачыла ўсіх дзяўчат з 6-й падгрупы III групы 2-га курса біяфака ў лабараторыі біяхіміі, дзе праходзілі практычныя заняткі. Дзяўчаты, а іх у падгрупе 10, захоплена чаравалі над колбамі і прабіркамі. То тут, то там чуўся узбуджаны шэпт: «Ой, а ў мяне атрымалася!», «Наташа, у цябе змяніўся колер раствору?», «А я ўжо ўсё зрабіла...»

Я старалася адгадаць, якія ўсё ж яны, гэтыя дзяўчаты, хоць знешне, з першага погляду гэта наўрад ці вызначыш.

Вось пра нешта спытала ў сваёй суседкі Лена Варанецкая — невялікага росту, смяшлівая дзяўчына. Непакорныя віхры стрыжаных валасоў надаюць яе твару бесклапотна-вясёлы выраз. Лене вельмі падабаюцца заняткі па вышэйшых раслінах. Яна гатова гадзінамі вывучаць будову розных травінак, імхоў, наглядаць пад мікраскопам унутраны свет сцяблінкі, ліста. Яна спадзяецца, што ў час будучай работы ў школе зможа перадаць сваю любоў да біялогіі вучням.

З Рымай Жалдаковай мы пазнаёміліся перад практычнымі заняткамі. Сонечнае святло залівала лабараторыю, адлюстроўвалася ў шкле мікраскопаў, якія паблісквалі на кожным стале. Мы сядзелі з Рымай адны, і яна ажыўлена расказвала пра сваіх сяброўак.

— Наша падгрупа вельмі дружная, нават выкладчыкі здзіўляюцца, як гэта мы так сышліся ўсе падобныя. Мы і на практыцы ў гэтым годзе ў Плешчаніцах ні на мінуту не расставаліся, усюды былі разам. Да чаго ж было цікава блукаць па лесе, збіраць розныя травы, імхі, запамінаць іх назвы!..

Непрыкметна лабараторыя запаўняецца дзяўчатамі: хутка званок. Хтосьці раскрыў падручнік і нешта дачытвае, нехта дзеліцца ўражаннямі аб учарашнім спектаклі, а нехта проста сядзіць і глядзіць у акно, любуючыся вясновым яркім сонцам. Але вось усё заціхла: у аўдыторыю ўвайшоў выкладчык...

— Біялогія з кожным семестрам, з кожным новым прадметам захапляе мяне ўсё больш і больш, — сказала мне Рыма. — Я нават цяпер не ўяўляю сябе без яе.

Так, Рыма любіць біялогію, асабліва ёй падабаецца мікрабіялогія. Разам са сваёй сяброўкай Аняй Лазаковіч яны ўваходзяць у студэнцкае навуковае таварыства на кафедры мікрабіялогіі. Абедзве — выдатніцы.

Вось і цяпер яны сядзяць побач, старанна замалёўваючы ўбачанае пад мікраскопам у свае альбомы.

...Пасля заняткаў мы ідзём з дзяўчатамі па доўгаму калідору універсітэта. У іх сёння яшчэ многа спраў. Галя Ганчарык спяшаецца дадому: трэба паспець пазаймацца англійскім, а вечарам — на рэпетыцыю хору. Наташа Майсеенка перагортвае альбом з нотамі. Гэта санаты Бетховена, аднаго з найбольш любімых яе кампазітараў.

— Наогул нашы дзяўчаты ўсе выдатныя. Мы часта бываем у тэатрах, на канцэртах, у кіно, ну, а пасля гэтага ўсёй групай абмяркоўваем толькі што ўбачанае. Часта горача спрачаемся, кожная адстойвае сваю думку, — гаворыць камсорг Наташа Галаўнёва.

— Шостая падгрупа — самая моцная на ўсім II курсе. Дзяўчаты неяк самі аб'ядналіся яшчэ на I курсе на бульбе. Вельмі дружныя, заўсёды з цікавасцю, з аддачай сустракаюць усе прапановы, — расказвае куратар групы Т. І. Запольская. — Амаль усе яны — актывісткі. Наташа Галаўнёва, камсорг групы, добрая студэнтка, ды яшчэ ўдзельнічае і ў самадзейнасці — танцуе ў «Крыжачку». Па ініцыятыве Ірыны Бондар, адказнай за культмасавую работу ў групе, часта арганізуюцца культпаходы, творчыя сустрэчы з вядомымі людзьмі. Дзяўчаты ў мяне малайцы.

Сапраўды дзяўчаты заўсёды і ва ўсім наперадзе. І нездарма рабяты з III групы II курса біяфака гавораць пра іх: «...Яны ў нас — самыя лепшыя...»

І. САВЕТКІНА.

# ДЗВЕ ДАРОГІ

Пра геаграфію яна спачатку не думала. Адразу ж пасля школы падала дакументы ў прыёмную камісію інстытута народнай гаспадаркі. І... не прайшла па конкурсу. Першыя няўдачы прымусілі задумацца: як быць далей?

Праца на Мінскім маторным заводзе стала пачаткам яе самастойнага жыцця. Арганізатарскія здольнасці дзяўчыны заўважылі таварышы. Яе выбралі сакратаром камсамольскай арганізацыі заводакіраўніцтва. Працавала добра. Праз нейкі час ёй прысвоілі званне ударніка камуністычнай працы. Гэта да многага абавязвала. Трэба было паспяваць усюды. А яшчэ і вучыцца далей таксама хацелася.

Акрамя таго, Валю вабілі падарожжы, клікалі турысцкія сцежкі, хацелася спазнаць рамантыку новых шляхоў і адкрыццяў. Валя падала заяву ў турыстычную секцыю завода. За 2 гады удзельнічала ў многіх паходах.

— Гэтае захапленне турызмам і прымусіла сур'ёзна падумаць пра геаграфію, — гаворыць сама Валя.

Дакументы ў БДУ падала неяк нечакана і для бацькоў, і для сяброў.

Цяпер Валя Мяшчэрская займаецца ўжо на III курсе геаграфічнага факультэта. Яна — член факультэцкага камітэта камсамола, адказная за работу культурна-масавага сектара. І сама — пастаянны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці.

Больш за ўсё дзяўчына любіць чытаць вершы.

Побач з Валяй на факультэцкай Дошцы гонару змешчана фатаграфія Тані Важнік, таксама трэцякурсніцы.

Таня паступіла ва універсітэт адразу ж пасля школы. Яе з дзяцінства цікавіла зямля, прырода. Хацелася больш ведаць аб гэтым.

— Тры гады выдатніца, выдатніца ва ўсім, — так сказалі пра яе ў камітэце камсамола.

Таня Важнік — старшыня савета выдатнікаў факультэта. Яна займаецца ў навуковым гуртку пры кафедры фізічнай геаграфіі СССР.

Справы гэтыя патрабуюць шмат часу, але дзяўчына заўсёды знойдзе хвілінку, каб дапамагчы кожнаму аднакурсніку, калі ўзнікае ў каго цяжкае пытанне.

А яшчэ Таня добра спявае.

Розныя дзяўчаты? Напэўна. Але аб'ядноўвае іх жаданне паспець зрабіць як мага больш і для сяброў, і для сябе, знайсці сваё месца ў жыцці.

Л. МАРОЗ,
студэнтка II курса вячэрняга аддзялення журфака.



**Змяняюцца пакаленні студэнтаў на хімічным факультэце, але заўсёды першай іх сустракае і праводзіць Ларыса Сяргееўна Германовіч, дыспетчар.**

Фота С. Дзеянкова.

# САКАВІК

**2** сакавіка — 175 год з дня нараджэння Я. А. Баратынскага (1800—1844), рускага паэта.

**6** сакавіка — 500 гадоу з дня нараджэння Мікеланджэла Буанароці (1475—1564), італьянскага скульптара, жывапісца, архітэктара і паэта.

**8** сакавіка — Міжнародны жаночы дзень.

**10** сакавіка—100 год з дня нараджэння А. Б. Гольдэнвейзера (1875—1961), савецкага піяніста, кампазітара.

**12** сакавіка—1917—Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Расіі. Звяржэнне царскага самадзяржаўя. Утварэнне Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

**12** сакавіка—80 год з дня нараджэння В. І. Кіквідзе (1895—1919), героя грамадзянскай вайны.

**12** сакавіка—1951—Вярхоўны Савет СССР прыняў закон аб абароне міру.

**14** сакавіка—1883—памёр Карл Маркс.

**18** сакавіка—Дзень Парыжскай Камуны.

**18** сакавіка—10 год назад (1965) касманаут А. А. Ляонаў упершыню ў гісторыі здзейсніў выхад у адкрыты космас з борта карабля «Усход-2», пілатуемага касманаўтам П. І. Бяляевым.

**19** сакавіка—80 год з дня нараджэння М. Ф. Рыльскага (1895—1964), украінскага савецкага паэта.

**21** сакавіка—150 год з дня нараджэння А. Ф. Мажайскага (1825—1890), рускага вынаходніка ў галіне авіяцыі.

**27** сакавіка—Міжнародны дзень тэатра.

**30** сакавіка—1971—адкрыццё XXIV з'езда КПСС.





**Працавітасць і дакладнасць, высокая якасць работы — вось што характэрна для пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва старшага бухгалтара В. А. Валадзько (злева) і намесніка галоўнага бухгалтара В. Г. Маркавай**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

## «ЗА ШТО ВЫ НАС ЛЮБІЦЕ?»

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).**

**— Якую прафесію вы лічыце самай жаночай?**

— Гадаваць дзяцей.

— Рэгуліроўшчыца. Якія прыгожыя, зграбныя рухі, і любавацца імі можа кожны. (Але я б не хацеў, каб мая жонка мела гэтую прафесію).

— Сястра міласэрдзя.

— Жонка.

— Я лічу, што калі жанчына, ды і любы чалавек, працуе па любімай рабоце, то іменна гэта прафесія і будзе ёй падыходзіць больш за ўсё.

**— Каго, перш за ўсё, вы хацелі б бачыць у сваей жонцы:**

**а) хатнюю гаспадыню; б) сябра; в) асобу; г) і інш.**

— Сябра і асобу.

— Перш за ўсё жонку, плюс усё астатняе

— «І інш.» плюс а), б), в).

**— На каго з вядомых жанчын вы хацелі б быць падобнымі?**

— Венера была адна. Я другой не стану. Не хачу быць падобным ні на адну.

— Нават самая вядомая жанчына заўсёды застаецца жанчынай. Таму я і не хацеў бы быць падобным ні на адну з іх.

— На Еву. Яна дала свету шчасце.

— Я хацеў бы быць падобным на Адама.

— Навошта мне быць падобным на каго-небудзь. Мне і так добра.

— Я б усё-такі хацеў быць падобным на якога-небудзь вядомага мужчыну.

Нягледзячы на тое, што амаль ніхто з хімікаў не хацеў быць падобным на жанчын, усе яны з задавальненнем адказвалі на пытанні і прасілі павіншаваць усіх дзяўчат з надыходзячым святам.

**Л. НІКУЛІНА.**

Ліда АКСАМІТ

## НЁМАН

Іду я сцежкай знаёмай,
Лаза гнецца долу ніц....

Дзень добры, магутны Нёман,
Бацька усіх нашых крыніц!..

Імчыцца, іграе, пятляе
Праз дзён летніх гарачыню.
Сабраў, дык і шчодра губляе
Крынічную рос чысціню.

## ВЯСНОВАЕ

Пралескі хтосьці па зямлі рассыпаў,
Паклікаў птушак з выраю дамоў,
Замаляваў зялёным шчасцем выспы,
Прайшоўся першым рэхам між бароў.

Уладзімір ЯГОЎДЗІК

А сонейка расхрыствае ўсмешкі,
І хмеліць голаў ад блакітнага святла...
Якая гэта з міліярдаў сцежкаў,
Каб да цябе, адзінай, пралягла?!.

Марыя БУРЭНКА

## МАМЕ

**Цёплымі, шурпатымі, ў мазолях**
**Валасы прыгладзь мае рукамі,**
**Імі ты прынесла ў хату золкам**
**Новы дзень вясны і шчасця, мама.**

**Ціха пабудзі ласкавым словам,**
**Прытулі, як некалі малую,**
**І ад шчырай ласкі той, матуля,**
**Я ў дзяцінстве зноў сябе адчую.**

**Дакрануся, нібы ненарокам,**
**Да гарачых рук тваіх рукамі,**
**Каб цяпло іх роднае, жывое,**
**Грэла усё жыццё усюды, мама.**

А ён не бачыў — йшла мая вясна,
Звінела жаўруком у промнях сонца,
Лілася той мелодыяй бясконцай,
А ён не бачыў — йшла мая вясна.

А ён не ведаў — сэрца трапятала
Ад хмельнае чаромхі да зары,
Ад песні салаўінай у бары,
А ён не ведаў — сэрца трапятала.

А ён не чуў, як клікала я песняй
Адведаць сок бярозавы, што мёд,
Падглядзець зор дзявочы карагод,
А ён не чуў, як клікала я песняй.

А ён не змог вясны маёй убачыць,
Яна мужнела ў бурах і дажджах,
Павольна расцвітала ў садах,
А ён не змог вясны маёй убачыць.



Тамара КУПРЭВІЧ

## ЁСЦЬ У МАТУЛІ

**Ёсць у матулі нешта ад бяроз...**
**Якою, мама, белаю ты стала!..**
**Хусцінкаю, змакрэлаю ад слёз,**
**Ты растані з дзяцьмі перавязала.**

**Ёсць у матулі нешта ад бяроз...**
**Нат малады свет без матулі — шэры!**
**«Макрэць хусцінцы і ад шчасця слёз»,**
**Чакаючы нас, верыш, верыш, верыш...**

## НАВАТ ЦІХІМ ГУКАМ...

*Нават ціхім гукам не хлусі;*
*Я табе аддана гэтак веру;*
*Не гасі надзею, не гасі, —*
*І пастукай ціха-ціха ў дзверы.*

СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## 30-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

На парад пастроены выкладчыкі і супрацоўнікі, удзельнікі спаборніцтваў па плаванню ў праграме V спартакіяды «Здароўе».

Спаборніцтвы адкрывае Герой Савецкага Саюза М. Я. Зайцаў. Абараняць гонар сваіх факультэтаў выйшлі людзі розных узростаў і званняў.

Першымі стартавалі жанчыны старэйшай узроставай групы на дыстанцыі 50 метраў.

У першым заплыве быў лепшы вынік у прадстаўніцы геаграфічнага факультэта В. Р. Сіняковай; II месца у Н. Л. Ганчаровай (гістфак) і III месца ў Н. А. Дабражанскай (гістфак).

Сярод мужчын гэтай групы стартаваў ветэран Вялікай Айчыннай вайны дацэнт Г. В. Авечкін (НДІ ПФП). Ён быў узнагароджан памятным сувенірам мясцовага камітэта. А І месца заняў ст. інжынер хімічнага факультэта А. В. Махнач. II месца — М. Я. Вакулюк (НДІ ПФП) і III месца — дацэнт, в. а. дэкана гістарычнага факультэта А. Г. Кляцкоў.

На дыстанцыі 100 м сярод жанчын з добрым вынікам (1.26,4 сек.) заняла першае месца Л. А. Клундук (НДІ ПФП). II месца—О. А. Сімакова (гістфак) і III месца — Н. І. Ганцук (ФПМ).

На гэтай жа дыстанцыі у мужчын I месца дасталося малодшаму навуковаму супрацоўніку В. С. Рачкевічу (НДІ ПФП) — 1.08,6 сек., II месца — С. М. Клёсаву (геафак) і III месца — Г. І. Папко (фізфак).

Галоўны суддзя спаборніцтваў Герой Савецкага Саюза М. Я. Зайцаў і старшыня мясцкома дацэнт І. Г. Родзін узнагародзілі прызёраў спаборніцтваў граматамі і уручылі ім сувеніры.

Камандныя месцы размеркаваны такім чынам: на І месцы НДІ ПФП, на II — хімічны факультэт, на III — гістарычны.

**М. ЦЕРАХАВА,**
**інструктар-метадыст,**
**майстар спорту СССР.**

## НА ЛЫЖНЫХ ТРАСАХ

У сонечны суботні дзень супрацоўнікі і выкладчыкі выехалі ў Зялёны Луг, каб прыняць удзел у V спартакіядзе «Здароўе». На старт выйшлі жанчыны і мужчыны розных узроставых груп.

Пасняхова прайшоў дыстанцыю 3 км ветэран Вялікай Айчыннай вайны М. Я. Гарбенка, супрацоўнік вылічальнага цэнтра.

Першынство па гэтай дыстанцыі заваяваў дэкан матэматычнага факультэта М. С. Гарашчук, на II месцы — Л. Ф. Корзун (фізфак), на III — В. Д. Сцепанюк (хімфак).

На дыстанцыі 1 км І месца заняла прадстаўніца фізічнага факультэта выкладчык Р. А. Сакалова.

У мужчын на трасе 5 км І месца заваяваў прадстаўнік геафака П. П. Явід, II — К. Н. Лапко (хімфак), III — В. С. Лабуноў (ВЦ).

У жанчын малодшай узроставай групы на дыстанцыі 3 км І месца заняла супрацоўніца НДІ ПФП Л. М. Шахлевіч, II — А. Я. Білім, III — Васілеўская.

У вынiку напружанай спартыўнай барацьбы перамогу атрымаў дружны калектыў вылічальнага цэнтра, на II месцы — фізічны факультэт, на III — матэматычны.

**В. НІКІЦІН,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2 000 экз. Аб'ём — 1 друк. ар. АТ 00126 Заказ № 392.

Рэдактар **А. А. НІКОЛЕНКА.**

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.